■ Крокі да Шагала

# На імяніны да Мастака

**У Віцебску 7 ліпеня з размахам адсвяткавалі 130-ю гадавіну з дня нараджэння Марка Шагала. Падарункам гораду стала графіка з яго партрэтам.**

Як заўсёды, на свята на ціхую вулачку Пакроўскую, дзе знаходзіцца дом-музей, прыйшло шмат гараджан і гасцей горада. Да помніка Шагалу ўсклалі кветкі. Сярод апошніх было нямала валошак, якія так любіў Марк Захаравіч.

Пад адкрытым небам выступалі гімнасты, акрабаты, ігралі аркестр і вулічныя музыканты. Вядома, гучалі і яўрэйскія мелодыі, песні.

Падчас шпацыру можна было ўбачыць герояў твораў Шагала, сцэнкі з гарадскога жыцця. А таксама прачытаць цытаты на агароджах — з успамінаў і вершаў знакамітага на ўвесь свет творцы. І нават... дапісаць словы пэндзлямі — любімым колерам мастака — сінім.

Артысты ў вобразах Шагала і яго жонкі Бэлы пад'ехалі да дома-музея на брычцы. Між іншым, сёлета музейнай установе 25 гадоў.

**Дырэктар Музея Марка Шагала Ірына ВОРАНАВА** падзялілася з публікай добрай навіной. Напярэдадні святкавання сталічныя мытнікі перадалі канфіскаваную чорна-белую гравюру з выявай Марка Шагала. Гэта — работа нямецкага мастака Германа Штрука. У яго на той час ужо эмігрант Шагал вучыўся ў Берліне майстэрству графікі.

— Партрэт зроблены ў 1922 годзе. У Штрука наш зямляк браў урокі па тэхніцы афорта і літаграфіі. І ў таленавітага педагога была традыцыя: рабіў партрэты ўсіх вучняў, — распавяла кіраўнік музея.



**Старшыня апякунскага савета Музея Марка Шагала, былая дырэктар Людміла ХМЯЛЬНІЦКАЯ** таксама падзялілася ўражаннямі:



— Імя мастака вярнулася нарэшце на Радзіму. А тое, што на «Шагалаўскія чытанні» прыязджаюць удзельнікі з-за акіяна — паказчык вялікага інтарэсу і павагі да памяці, бадай, самага знакамітага віцябчаніна.

На жаль, не дажыў да Шагалаўскага юбілею вядомы віцебскі паэт, публіцыст Давід Рыгоравіч Сімановіч. Яго вельмі не хапала на свяце. Ён шмат чаго зрабіў, каб Віцебск зноў «стаў родным» для Шагала. Прысвячаў яму вершы, артыкулы. Паэт сябраваў з вядомымі літаратарамі з розных краін, узначальваў «Шагалаўскі камітэт». Яго кватэра была адчынена для творчых людзей і тых, хто, як і ён, любяць Віцебск, ведаюць гісторыю горада.

Вечарам недалёка ад Дома-музея адбыўся арт-перформанс «Васільковае неба». На тэрыторыі комплексу «Залатое кальцо горада Віцебска «Дзвіна» можна было ўбачыць рэканструкцыю жыцця часоў Шагала.

Мерапрыемствы, прысвечаныя юбілею, яшчэ будуць працягвацца.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*





# ДЗЕ НА ВЁСЦЫ КПП?




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аналагічнае становішча ў Іўеўскім раёне. Прыватны сектар арандуе тут пяць былых КПП. Але адрамантаваць абутак, скарыстацца хімчысткай альбо пастрыгчыся можна далёка не ўсюды. Жыхары населеных пунктаў з такой сітуацыяй мірыцца не гатовы. Пасля неаднаразовых іх зваротаў у розныя інстанцыі ў аграгарадку Падароск Ваўкавыскага раёна ўсё ж такі адкрылі цырульню.

**Наша даведка**

**У 2016 годзе ў рамках праграмы «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе» камбінатам бытавога абслугоўвання Гродзенскай вобласці накіравана каля 200 тыс. рублёў, якія выкарыстоўваліся на пагашэнне крэдытаў, выплату заработнай платы, падаткаў, іншых плацяжоў.**

— А між іншым, у краіне зацверджана дзяржаўная праграма «Камфортнае жыллё і спрыяльнае асяроддзе», разлічаная да 2020 года, — паведаміў **старшыня Камітэта дзяржкантролю Гродзенскай вобласці Анатоль ДАРОЖКА.** — А ў ёй прапісана, што насельніцтва, незалежна ад месца пражывання, павінна быць забяспечана якаснымі бытавымі паслугамі па даступных цэнах. Праверкі дзяржкантролю паказалі, што не ва ўсіх райцэнтрах вобласці наладжана работа арганізацый бытавога абслугоўвання з шырокім спектрам паслуг.

У Гродзенскай вобласці стандарты па «бытоўцы» выконваюцца, функцыянуе больш за 3,5 тыс. аб'ектаў. За мінулы год колькасць павялічылася на 503, у тым ліку ў сельскай мясцовасці з'явілася каля 100 новых аб'ектаў паслуг. Ёсць прырост і ў гэтым годзе. Аднак «болевымі» кропкамі застаюцца вёскі і аграгарадкі. Не ў поўнай ступені сеткай комплексных прыёмных пунктаў ахоплены Воранаўскі, Гродзенскі, Дзятлаўскі і Шчучынскі раёны. Непакоіць кантралёраў і праблема неплацяжоў. Запазычанасць камбіната бытавога абслугоўвання перад бюджэтам за мінулы год склала 666 тыс. рублёў, амаль палова гэтых сродкаў — пеня. Таму і стараюцца ў раёнах пазбавіцца ад нерэнтабельных аб'ектаў: папросту іх закрыць. Будынкі і абсталяванне пры гэтым не выкарыстоўваюцца, тэрыторыя зарастае травой.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

**У тэму**

**Аляксей САДОЎСКІ, намеснік старшыні Шчучынскага райвыканкама:**

— З-за высокай запазычанасці мы вымушаны былі закрыць камбінат бытавога абслугоўвання. Паступова разлічыліся з работнікамі, выплацілі даўгі. Паэтапна перавялі паслугі на індывідуальных прадпрымальнікаў. Перадалі ім швейны цэх, і ён працуе. Здалі ў арэнду абутковую майстэрню. Працуюць тры прыватныя цырульні. Будзем прапаноўваць нашым работнікам адкрыць ІП у аграгарадках. Лічу, што трэба пазбавіцца фармалізму ў рабоце. А для гэтага перавесці паслугі ў прыватны сектар.

**Алена БУБЕНЧЫК, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама:**

— У рэгіёне павінна развівацца і дзяржаўная, і прыватная сфера. І не толькі на паперы. Пакуль гэта не так. Жыхары сельскай мясцовасці падчас прыёму выказваюць прэтэнзіі па рабоце «бытоўкі». Магчыма, стандарты будуць аптымізаваны, але не адменены. Калі адмянілі адзін від паслугі, трэба прапанаваць нешта ўзамен. Што датычыцца памяшканняў, іх трэба ўцягнуць у гаспадарчы абарот не толькі продажам, але і бясплатнай перадачай альбо арэндай. Улада на месцы павінна прымяніць усе механізмы для аказання бытавых паслуг і дапамогі суб'ектам гаспадарання, гэта адбываецца не ў поўнай ступені.

■ Мы — актыўныя!

# Хто лепшы на веласіпедзе?

## Падчас маштабнага спартыўнага свята ў Мінску выбралі «Веламіс-2017»




**Тытул «Веламіс-2017» і першы прыз атрымала Ганна Якуцік, выпускніца факультэта міжнародных адносін БДУ. Зараз Ганна працуе бізнес-аналітыкам у ІТ-кампаніі.**

Пераможца прызнаецца, што спецыяльна да конкурсу яна не рыхтавалася. Дзяўчына вырашыла паспрабаваць свае сілы, калі прыйшла да Палаца спорту, дзе сярод прафесійных гоншчыкаў разыгрываўся «Гран-пры Мінска».

Удзельніцы «Веламіс-2017» спаборнічалі ў розных конкурсах. Напрыклад, дзяўчаты павінны былі ўпрыгожыць свой веласіпед, праехаць на велатрэнажоры на ўсю хуткасць і, нават, прайсціся па чырвонай дарожцы перад журы.

Анастасія Більдзюг перамагла ў намінацыі «Міс веласпорт», а тытул «Міс велаграцыя» атрымала Станіслава Кміт.

Конкурс праходзіў у ходзе спаборніцтваў па веласіпедным спорце на шашы «Кубак Мінска» і «Гран-пры Мінска». Удзел прынялі 24 прафесійныя велакаманды з 14 краін. Заўзятары маглі назіраць за ўдзельнікамі на вялікім экране ГЗЦ Galleria Minsk.

Падчас маштабнага веласіпеднага свята была ўручана вялікая колькасць каштоўных прызоў, у тым ліку і веласіпеды.

Таксама ў фанатаў была магчымасць прыняць удзел у розных спаборніцтвах. У зонах фінішу былі размешчаны пляцоўкі са спартыўнымі трэнажорамі, зона фуд-кортаў і модных упрыгожанняў, спот для моладзі з фарбамі холі. На галоўнай сцэне выступілі вядомы грузінскі танцавальны ансамбль Lelo і група NaviBand.

Арганізатарам спартыўных спаборніцтваў «Кубак Мінска», «Гран-пры Мінска» і «Веламіс-2017», а таксама свята для заўзятараў выступіў веласіпедны клуб «Мінск» пры падтрымцы Мінгарвыканкама, Мінаблвыканкама, Міністэрства спорту і турызму Беларусі, Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

**Юлія МІНІЧ**



Фота БЕЛТА.

## Фільм пра ліквідацыю наступстваў стыхіі

**Завяршыліся здымкі стужкі, якая расказвае пра тое, як лесаводы краіны ліквідавалі наступствы ўрагану, што пашкодзіў лясны фонд краіны летам мінулага года.**

Здымкі фільма вяліся дзесяць месяцаў. У яго ўвайшлі і распрацоўка буралому, і асенне-вясенняе лесааднаўленне пашкоджаных участкаў, і найцяжэйшыя ўмовы работы на цяжкадаступных месцах, паведамілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*